**Шаматульская Л. А.,**
настаўнік працоўнага навучання
Акцябрскай СШ Лагойскага раёна

# Вялікдзень: «сёння ў нашай хаце свята»

## Урок працоўнага навучання ў 8 класе

**Тэма ўрока:** Азбука этыкета. Асаблівасці арганізацыі свята.
**Практычная работа:** Выраб падарунка да свята Вялікдзень (велікоднае яйка).

**Адукацыйныя мэты:**

- фарміраванне ведаў аб асаблівасцях арганізацыі свята ў доме, умення прымаць гасцей;
- набыццё вопыту гаспадарча-бытавой дзейнасці па выкананні сацыяльнай ролі гаспадыні дома;
- набыццё навыкаў вырабу падарунка да свята Вялікдзень.

**Задачы асобаснага развіцця вучняў:**

- садзейнічаць развіццю пазнавальных інтарэсаў, творчых здольнасцей, фарміраванню ўменняў самаацэнкі, ўзаемаацэнкі;
- спрыяць выхаванню этычнай культуры, маральных каштоўнасцей, павагі ў адносінах да другіх людзей, адказнасці за вынікі сваёй працы.

**Тып урока:** камбінаваны ўрок: вывучэнне новага матэрыялу з выкананнем практычнай работы і першасным замацаваннем ведаў і спосабаў дзейнасці.

**Абсталяванне:** фанаграма песні «Сёння ў нашай хаце свята», запіс песні «Ave Maria», карткі з тэарэтычнымі звесткамі для работы ў групах, тэставыя заданні, выстаўка разнастайных вырабаў-сувеніраў да свята Вялікдзень, неабходныя матэрыялы і прыстасаванні для выканання практычнай работы.

**Эпіграф да ўрока:** «Умей у людзей пагасціць і к сабе запрасіць, да варот праводзіць і назад вароціць». Прыказка.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

Прывітанне настаўніка, прывітанне гасцей.

Настрой на поспех:

– Я змагу выканаць усе заданні.
– У мяне ўсё атрымаецца.
– Жадаю поспеху сабе і таварышам.

Усмешкі вучняў адзін аднаму.

**II. Актуалізацыя ведаў і суб’ектыўнага вопыту вучняў**

Гутарка па тэме папярэдняга ўрока «Азбука этыкета. Свята ў доме»:

– Што такое этыкет? (Звод правілаў паводзін, прынятых у грамадстве).
– Якія вы ведаеце традыцыі? (Нацыянальныя, сямейныя).


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

– Як можна класіфікаваць святы? (Дзяржаўныя, рэлігійныя, абрадавыя, сямейныя, асобасныя).
– Якія беларускія нацыянальныя святы і абрады вы ведаеце? (Каляды, Масленіца, Юр'я, Троіца, Дажынкі, Купалле і інш.)

**Вывад:** задача кожнага чалавека захоўваць свае нацыянальныя і сямейныя традыцыі. Этыкет абумоўлівае правілы паводзін, прынятыя ў грамадстве, у тым ліку і правілы, па якіх арганізоўваецця свята ў доме, прымаюцца госці.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу**

Паведамленне тэмы і мэты ўрока.

**Мэты ўрока для вучняў:**

- Ведаць асаблівасці арганізацыі свята ў доме.
- Умець запрашаць гасцей, рыхтавацца да іх прыёму, сустракаць і праважаць гасцей.
- Умець вырабляць сувенір да свята Вялікдзень – яйка велікоднае.

(Гучыць фанаграма песні «Сёння ў нашай хаце свята».)

Так, яшчэ Статут Вялікага княства Літоўскага, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы, вучыў, як паводзіць сябе ў гасцях, як прымаць госця.

Умець арганізаваць свята ў доме – гэта вялікае мастацтва. Каб свята прайшло ўдала, а госці засталіся задаволеныя, гаспадару і гаспадыні патрэбна ведаць і выконваць агульнапрынятыя правілы гасціннасці, якія мы зараз вывучым, паўторым, успомнім.

Працаваць будзем па групах. У кожнай групы сваё заданне. Ролі ў групах размеркаваны: ёсць "эксперты" і "артысты". "Артысты атрымалі апераджальнае заданне падрыхтаваць дома невялічкія мініяцюры па пытаннях тэарэтычнай часткі ўрока.

**1. Заданне групам.**

Заданні для вывучэння 1 групе:

- Запрашэнне ў госці.
- Падрыхтоўка да прыёму гасцей.

Заданні для вывучэння 2 групе:

- Сустрэча гасцей.
- Як забаўляць гасцей.
- Провады гасцей.

(Дадатак 1)

**2. Работа ў групах.**

Настаўнік назірае, кансультуе, пры неабходнасці.

**3. Выступленне вучаніц.**

«Артысты» паказваюць падрыхтаваныя мініяцюры.

Пытанні для экспертаў 1 групы:

– Як правільна запрашаць у госці?


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

– Якія работы неабходна выканаць перад прыёмам гасцей?

Пытанні экспертам 2 групы:

– Ці правільна сустрэлі гасцей нашы «артысты»?
– Як забаўляць гасцей, каб нікому не было сумна?
– Што гавораць нам правілы этыкету аб провадах гасцей?

Вучні пры неабходнасці дапаўняюць адказы «экспертаў», задаюць пытанні, калі што незразумела.

**IV. Праверка засваення і замацаванне новага матэрыялу**

Тэставы кантоль (Е. А. Гукасян. Тэсты кантролю ведаў. Ст. 21).

Тэсты правяраюцца метадам узаемакантролю, пасля таго як на дошцы вывешваецца табліца правільных адказаў.

**V. Практычная работа**

**Выраб падарунка да свята Вялікдзень (велікоднае яйка)**

***1. Уводны інструктаж***

Светлы дзень Вялікадня, несумненна, стаў тым днём, калі людзі з дабром звяртаюцца да блізкіх, прабачаюць адзін аднаму ўсе крыўды, радуюцца наступаючай вясне. І асаблівае задавальненне для дзяцей і дарослых прыносіць падрыхтоўка да светлай нядзелі, выраб падарункаў. Зусім хутка свята ізноў увойдзе ў нашы дамы. Давайце і мы зробім што-небудзь незвычайнае!

Звяртаецца ўвага вучаніц на выстаўку разнастайных вырабаў-сувеніраў да свята Вялікдзень. Яны выкананы ў розных тэхніках. Тут і мяккая цацка (ярка-жоўтае кураня), і вышываныя сурвэткі, і падстаўкі для яец (звязаныя кручком і зробленыя з каляровай кардоны), дэкаратыўныя птушачкі (зробленыя са шкарлупіны яец), саламяныя вырабы і інш.

Сёння на ўроку мы выканаем падарунак да свята Вялікдзень – велікоднае яйка. Працуем па тэхналагічных картах, паслядоўна выконваючы адну аперацыю за другой.

***2. Правілы бяспекі працы***

Так як працаваць мы будзем, карыстаючыся іголкай і нажніцамі, то спачатку паўторым правілы бяспекі працы пры рабоце з гэтымі прадметамі. (Дадатак 2)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні пры выкананні практычнай работы. (Дадатак 2)

3. ***Самастойная работа*** (Дадатак 3)

(Гучыць запіс песні «Ave Maria»).

Настаўнік назірае, дапамагае, кансультуе, сочыць за выкананнем правіл бяспечнай працы і санітарна-гігіенічных патрабаванняў.

**Фізкультмінутка.**

Выконваюцца практыкаванні для вачэй (2–3 хвіліны).


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

*4. Заключны інструктаж*

Падвядзенне вынікаў практычнай работы. Разбор і аналіз памылак, недахопаў. Выстаўленне адзнак.

**VI. Рэфлексія**

Урок блізіцца да канца, і мне б хацелася зрабіць рэфлексійную адзнаку працы на ўроку:

- Што новага вы даведаліся на ўроку?
- Які від дзейнасці найбольш спадабаўся?
- У чым адчувалі цяжкасці?
- Што зрабілі правільна?
- Што трэба было зрабіць па-іншаму?
- Як вы сябе адчувалі ў пачатку ўрока, у сярэдзіне, у канцы?

**VII. Абагульненне. Вынік урока**

Сёння на ўроку мы з вамі былі і гаспадарамі, якія прымаюць гасцей, і гасцямі. Мы даведаліся, што арганізаваць свята – гэта вялікае мастацтва.

Якія этапы падрыхтоўкі да свята вы ведаеце?

На практычнай частцы ўрока мы навучыліся выраблять падарунак – велікоднае яйка. Цяпер вы заўсёды знойдзеце, чым парадаваць да свята сваіх родных і блізкіх.

Усім вялікае дзякуй за работу на ўроку.

Дадатак 1.

1. **Запрашэнне гасцей.**

Перш за ўсё гаспадары павінны скласці спіс гасцей. Пажадана, каб у запрошаных было дастаткова агульных інтарэсаў, што вельмі важна для гутарак і забаў. Гасцей абавязаны запрасіць самі гаспадары, непрыстойна рабіць гэта праз другіх гасцей. Усіх належыць запрашаць адначасова, каб ні ў кога не склалася ўражанне, быццам яго пазвалі выпадкова, з-за таго, што нехта з больш жаданых гасцей не змог прыйсці.

Запрашэнне павінна быць зроблена загадзя. Звычайна гэта робяць за тыдзень, ці за некалькі дзён да ўрачыстасці. Калі нехта з запрошаных, падзякаваўшы за ўвагу, адмаўляецца прыйсці, нельга патрабаваць тлумачэнняў і крыўдзіцца.

Форма запрашэння гасцей на свята можа быць розная: пры асабістай сустрэчы, пісьмова, па тэлефоне.

2. **Падрыхтоўка да прыёму гасцей.**

Па правілах этыкету да прыходу гасцей ўсё павінна быць гатова. Усе работы па падрыхтоўцы да свята кладуцца на гаспадароў (дарослых і дзяцей). Калі ў доме мала ці няма памочнікаў, можна запрасіць каго-небудзь з блізкіх сяброў прыйсці на гадзіну-другую раней і дапамагчы.


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

Для прыёма гасцей, перш за ўсё, патрэбна падрыхтаваць памяшканне. Кватэра павінна быць у поўным парадку. Трэба загадзя ачысціць гардэроб, расставіць кветкі, паклапаціцца аб дастатковым асвятленні кватэры.

Усе падрыхтоўчыя работы неабходна закончыць за гадзіну да прыходу гасцей. Потым усе члены сям'і апранаюцца па-святочнаму. Тым самым гаспадары робяць сабе святочны настрой, а гасцям даюць зразумець, што яны рыхтаваліся да іх прыходу і радыя іх бачыць. Апошнія 15 хвілін выкарыстоўваюцца для адпачынку і настрою на святочны лад.

3. **Сустрэча гасцей.**

Першых гасцей гаспадары хаты сустракаюць у пярэднім пакоі. Вітаючыся, яны сустракаюць кожнага ветлівай усмешкай.

Пасля прывітання і ўручэння падарункаў, гаспадары дапамагаюць гасцям зняць верхняе адзенне і праводзяць у пакой. Гаспадыня ідзе ўперадзе гасцей, а гаспадар ззаду. Гасцям прапануецца прысесці. Калі ў госці прыйшлі новыя людзі, іх трэба абавязкова пазнаёміць з іншымі гасцямі. Гасцей, якія спазняюцца, чакаюць, звычайна, не больш за 15 хвілін, пасля чаго гаспадыня запрашае ўсіх да стала.

4. **Забаўленне гасцей.**

Вечарына не атрымаецца ўдалай, калі гаспадары звядуць яе да таго, каб як мага больш падрыхтаваць ежы і заняць гасцей яе паяданнем.

Вялікае месца адводзіцца музыцы. Сярод запрошаных заўсёды знойдуцца людзі, якія добра спяваюць. Дзе музыка, там і танцы. Гаспадарам патрэбна заўсёды ўлічваць густы гасцей. Танцавальныя мелодыі павінны выбірацца па іх жаданню. Але танцаваць і спяваць увесь вечар стомна, таму гаспадарам патрэбна загадзя паклапаціцца і скласці цікавую праграму.

5. **Провады гасцей.**

Ветлівыя людзі заўсёды строга прытрымліваюцца агульна прынятага тэрміну знаходжання ў гасцях. Гаспадары павінны помятаць, што яны адказваюць за сваіх гасцей, за іх настрой і самаадчуванне, а таксама за тое, каб яны ў час вярнуліся дадому.

Развітваючыся, гаспадары выказваюць удзячнасць гасцям за тое, што яны наведалі іх і жадаюць добрага шляху. Гаспадар праводзіць кожнага госця да дзвярэй, прычым, госць ідзе ўперадзе, а гаспадар за ім. Гаспадыня застаецца ў пакоі з астатнімі гасцямі. Гаспадар дапамагае адзецца, як жанчынам, так і мужчынам. Затым госць сам адкрывае дзверы і выходзіць.

Калі госці адыходзяць усе адразу, то іх суправаджаюць і гаспадар, і гаспадыня.


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

Дадатак 2.

**Правілы бяспекі працы пры рабоце з нажніцамі і іголкай.**

1. Не кладзіце іголку на стол у час працы, не ўтыкайце ў адзенне, захоўвайце іголку ў ігольніцы.
2. Перадавайце іголку ў ігольніцы.
3. Не выкарыстоўвайце для працы іржавую іголку.
4. Кладзіце нажніцы з самкнутымі лёзамі справа ад сябе на адлегласці 20 см. ад стала.
5. Нажніцы павінны быць добра адрэгуляваныя і завостраныя.
6. Перадавайце нажніцы колцамі ўперад.

**Санітарна-гігіенічныя патрабаванні.**

1. Рабочае месца павінна быць добра асветлена.
2. Сядзець трэба прама, злёгку нахіліўшы галаву, адлегласць ад вачэй да вырабу прыкладна роўна 30 см.
3. У працэсе працы неабходна перыядычна мяняць становішча корпуса (ад прамога да злёгку сагнутага і наадварот).
4. Нельга абапірацца грудзьмі аб стол, корпус павінен быць на адлегласці 10-15 см. ад краю стала.
5. Ногі цвёрда абапіраюцца ўсёй падэшвай аб падлогу.


© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf

Дадатак 3

## Тэхналагічная карта
## Выраб сувеніра «Яйка велікоднае».

| № | Паслядоўнасць выканання работы | Эскіз | Інструменты і матэрыялы |
|---|---|---|---|
| 1 | Падрыхтоўка шкарлупіны яйка:<br>а) палажыць яйка на 2–3 гадзіны ў салёную ваду;<br>б) пракалоць іголкай дзве адтуліны і выдуць змесціва;<br>в) абклеіць шкарлупіну 3–4 слаямі тонкай паперы. |  | Яйцо, салёная вада<br><br>Тоўстая іголка<br><br>Клей ПВА, тонкая папера |
| 2 | Абматванне яйка стужкай:<br>а) шпількай замацаваць стужку на вострым канцы яйка;<br>б) раўнамерна абматаць стужку вакол яйка, канец стужкі замацаваць некалькімі шыўкамі. |  | Шпілька, атласная стужка<br><br>Стужка, іголка, ніткі |
| 3 | Упрыгожванне яйка:<br>а) па ўсяму яйцу нашыць бісер, адначасова замацоўваючы краі стужкі;<br>б) з астаткаў стужкі завязаць бант і прышыць яго да верху яйка. |  | Бісер, іголка, ніткі<br><br>Стужка, іголка, ніткі |

**Шаматульская Л. А.,** настаўнік працоўнага навучання Акцябрскай СШ
Лагойскага раёна
**Вялікдзень: «сёння ў нашай хаце свята»** (урок працоўнага навучання ў 8 класе)
© «Народная асвета», 2008, №4: www.n-asveta.com\dadatki\mk\shamatulskaya.pdf